РАБОТНІЦА і КАЛГАСЬНІЦА

БЕЛАРУСІ

№ 2

Работніца і Калгасьніца
БЕЛАРУСІ

Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

СТУДЗЕНЬ 1933 г.
№ 2 (182)

Рыхтуйцеся да штурму першай вясны другой пяцігодкі

Зварот калгасьніц Маскоўскай вобласьці да ўсіх калгасьніц Савецкага саюзу

Таварышы калгасьніцы!

У той час, калі ў краінах капіталізму мільёны жанчын і дзяцей, у выніку пашырэньня эканамічнага крызісу, беспрацоўя і разбурэньня мільёнаў сялянскіх гаспадарак, кінуты ў абнімкі вуліцы, голаду і галечы,—у краіне Саветаў пераможна заканчваецца першая пяцігодка, даўшая краіне вялізарнейшыя гіганты індустрыі, ператварыўшая СССР з краіны дробнага і драбнейшага зямляробства ў краіну самага буйнага зямляробства ў сьвеце.

З кожным днём паляпшаецца матар'яльнае і культурна-бытавое становішча працоўных мас гораду і вёскі. Растуць новыя дамы, школы, дзіцячыя яслі, сады, вызваляючы пралетарак і калгасьніц ад цяжкасьцяй кухні і хатняга рабства.

Сёньня на нашым зьлёце калгасьніц мы заяўляем: таварышы пралетары і пралетаркі краіны Саветаў!

У вашай гераічнай барацьбе мы з вамі.

Мы захоплены з вамі адзінай воляй, воляй да перамогі, да пабудовы сапраўднага бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва.

Мы абвяшчаем сябе ўдарніцамі імя 15 гадавіны Кастрычніка і бярэм на сябе наступныя абавязацельствы:

1. На аснове ўказаньняў Маскоўскага камітэту партыі поўнасьцю закончыць да 1-га студзеня 1933 году разьмеркаваньне даходаў і ўраджаю 1932 году.

2. Поўнасьцю выканаць плян загатовак бульбы і арганізаваць жаночыя брыгады ў дапамогу адстаючым па загатоўцы бульбы калгасам.

3. Поўнасьцю захаваць загатаваную гародніну, прымацаваць сталыя кантрольныя пасты да хавальнікаў гародніны для назіраньня і дапамогі ў пераборцы і догляду іх.

4. Сустрэць ва ўсеўзбраеньні першую вясну II пяцігодкі, скарыстаць кожны дзень, кожную гадзіну для бальшавіцкай падрыхтоўкі да веснавой сяўбы:

а) Зараз-жа распачаць праверку ходу ссыпкі насенных фондаў і становішча хавальнікаў і захаваць на 100 проц. насеньне.

б) Поўнасьцю выканаць агратэхнічныя патрабаваньні, забясьпечваючыя падваеньне ўраджайнасьці.

в) Скласьці цьвёрдую кармовую базу для жывёлы, правільна скарыстаць і захаваць кармы.

г) Асаблівую ўвагу зьвярнуць на догляд конскай цягавай сілы і жывёлы (ацяпленьне скотных двароў, стайняў, сваячасовы корм жывёлы, чыстка і г. д.).

д) Да 1-га сакавіка закончыць рамонт сельскагаспадарчага інвэнтару і калёс.

е) Замацаваць сталыя калгасныя брыгады, прагледзець і палепшыць іх склад.

ж) Прыцягнуць ня менш 40 проц. калгасьніц на арганізуемыя курсы падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі калгасьніц і замацаваць іх на рабоце.

з) Зараз-жа прыступіць у кожным калгасе да распрацоўкі плянаў культурна бытавога абслугоўваньня калгасьніц да веснавой пасеўнай і ўборачнай кампаніі 1933 году. Падрыхтаваць памяшканьні для ясьляй, дзіцячых пляцовак, сталовак, прыступіць да падшуканьня і набыцьця абсталяваньня, складаньня харчовых фондаў і падрыхтоўкі кадраў бытавым установам.

Таварышы калгасьніцы! Уступайце ў рады ўдарніц імя 15 гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі. Пакажэце сапраўдныя ўзоры работы на фронце сацыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі.

Будзем памятаць, што клясавы вораг, кулак, усялякімі сродкамі і сіламі яшчэ імкнецца і будзе імкнуцца перашкаджаць нам будаваць сацыялізм.

Установім цьвёрды штодзенны кантроль і ўлік нашага сацыялістычнага дабра. Бязьлітасьней будзем змагацца супроць кулакоў, спэкулянтаў і зладзеяў, якія раскрадваюць нашу грамадзкую ўласнасьць.

Узмоцнім сваю клясавую пільнасьць, павысім свае палітычныя і агратэхнічныя веды.

Няхай жыве ленінскі Цэнтральны камітэт нашай партыі на чале з лепшым вучнем Леніна, улюбёным правадыром сусьветнага пралетарыяту тав. Сталіным!

Няхай жыве Маскоўская арганізацыя бальшавікоў на чале з тав. Кагановічам!

Новай хваляй сацспаборніцтва і ўдарніцтва адкажам на заклік маскоўскіх калгасьніц

У выкананьне задач, пастаўленых партыяй і ўрадам у галіне сельскай гаспадаркі, калгасьніцы Маскоўскай вобласьці ўзялі на сябе рад абавязацельстваў і зьвярнуліся з адозвай да ўсіх калгасьніц Саюзу.

Калгасьніцы Беларусі павінны адгукнуцца на гэту адозву. Сьнежаньскі пленум ЦК КП(б)Б даў выразную дырэктыву ў галіне павышэньня ўраджайнасьці і падрыхтоўкі да 4 бальшавіцкай вясны.

Пастанова пленуму гаворыць, што „ў выкананьні намечаных канкрэтных заданьняў па павышэньні ўраджайнасьці і плянаў сяўбы выключнае значэньне мае сваячасовая і арганізаваная падрыхтоўка і правядзеньне веснавой сяўбы".

Абгаворваючы адозву маскоўскіх калгасьніц, калгасьніцы Беларусі і асабліва калгасныя дэлегацкія сходы павінны ўзяць на сябе рад абавязацельстваў, якія-б забясьпечылі поўнае і сваячасовае выкананьне дырэктыў сьнежаньскага пленуму.

Рэдакцыя.

Дэлегаткі калгасу „Чырвонаармеец"— лепшыя ўдарніцы

Хутка сабраліся дэлегаткі калгасу „Чырвонаармеец" на свой сход. З 37 чалавек зьявіліся 32. Уважліва праслухалі даклад аб павышэньні ўраджайнасьці і аб задачах, якія паставіў сьнежаньскі пленум ЦК КП(б)Б перад саўгасамі, МТС і калгасамі і аднаасобным сэктарам.

У сваіх выступленьнях дэлегаткі крытыкавалі працу праўленьня, якое не змагалася за ўраджай.

— Праўленьне дрэнна арганізоўвала працу—гаворыць Юлька Кузьміч.—Мы, жанчыны, улетку, калі буракі зарасталі травою, хадзілі без работы. Калі мы прасілі працы, брыгадзір казаў—ідзі спаць ці фасолю лузаць. І ў выніку такой нядбайнасьці як брыгадзіра, так і самога праўленьня буракі прапалі, зарасьлі травою і іх прышлося скасіць на сілас. Частку буракоў выкапалі, але праз безгаспадарчасьць брыгадзіра і тыя пагнілі, званеныя ў кучу. Брыгадзір абавязкова павінен адказаць за гэта, аднак, да гэтага часу праўленьне яго пакрывае.

Семяновіч Дуня крытыкавала праўленьне за няправільнае разьмеркаваньне прэмій. Атрымаў прэмію ня той, хто больш і лепш працаваў, а той, хто мае дзяцей і ў хаце зьяўляецца аднэй гаспадыняй.

— Такі парадак прэміяваньня— кажа Дуня—зусім не заахвочвае лепш працаваць.

Прышлося паклікаць старшыню калгасу на сход, каб ён даў адказ на цэлы рад пастаўленых дэлегаткамі пытаньняў.

Дэлегаткі прасілі, каб праз два тыдні на наступным сваім сходзе старшыня зрабіў даклад аб разьмеркаваньні ўраджаю ў калгасе.

Было праведзена прымацаваньне дэлегатак для практычнай працы да праўленьня калгасу, школы і каапэрацыі.

Вылучылі брыгаду з трох чалавек для правядзеньня падпіскі на часопісь „Работніца і калгасьніца Беларусі". Дэлегаткі прасілі, каб у нумарох часопісі давалі выкрайкі і ручную працу. Дэлегаткі абяцалі падтрымліваць цесную сувязь з часопісьсю і пісаць аб працы свайго калгасу.

На працы дэлегаткі паказваюць прыклад.

Нормы па мяцьці ільну дэлегаткі перавыконваюць. На драўлянай ручной мялцы Надзя Шкраба зьнімае 80 жмень замест нормы ў 40 жмень. Не адстаюць ад яе Казлоўская Волька, Семяновіч Дуня, Лазарэвіч Доня, Гаўрушыц Наста і Кучык Стэфа.

Пацэйкаўская партячэйка дрэнна кіравала працай дэлегацкага сходу. Зараз кіраўнікоў вылучыла пагранічная партячэйка і праведзены сход гаворыць аб жаданьні дэлегатак працаваць, трэба толькі правільна накіраваць іх энтузіязм і жаданьне.

Дэлегаткі вёскі Траянава і калгасу „Дванаццацігодзьдзе" павінны ўзяць прыклад з дэлегатак калгасу „Чырвонаармеец".

Волька.

Капыльскі раён,
Пацэйкаўскі сельсавет.

Арганізавалі калгас імя другой пяцігодкі

Шляхам правядзеньня масавараслумачальнай работы і правільнага правядзеньня палітыкі партыі на вёсцы, бяднячкі і сераднячкі вёскі Хінаўка, Амговіцкага сельсавету (Слуцкі раён) выканалі і перавыканалі свае абавязкі перад дзяржавай па ўсіх відах загатовак. Па збожжы—на 125 проц., бульбе—100, ільнавалакне—130 проц., таксама і па іншых відах загатовак пляны выкананы.

Пераканаўшыся ў перавазе калектыўнай гаспадаркі перад аднаасобнай, у першы дзень другой пяцігодкі ў вёсцы Хінаўка арганізаваўся новы калгас імя другой пяцігодкі, у які адразу ўвайшло 17 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак.

На сваім сходзе калгасьніцы вёскі Хінаўка—учарайшыя аднаасобніцы—бяднячкі і сераднячкі—заявілі: „мы, арганізаваўшыся ў калгас, пад кіраўніцтвам партыі будзем змагацца за арганізацыйна гаспадарчае ўмацаваньне калгасу, за павышэньне ўраджайнасьці сацыялістычных палёў і датэрміновае выкананьне сваіх абавязкаў перад дзяржавай".

Я. Кучур.

Слуцкі раён.

З працай справіліся, рыхтуемся да вясны

Жаночая брыгада калгасу „Дзесяцігодзьдзе Беларусі" ў складзе 25 жанчын ударна правяла ўсю працу ў калгасе. Зараз ударна рыхтуемся да вясны.

Арганізавана новая ўдарная брыгада з 7 асоб, на чале якой стаіць брыгадзір Будкевіч Наста, якая добра арганізоўвае працу ў калгасе. Зараз брыгада прыступіла да ачысткі насеньня і ссыпкі насенфондаў. Лепшыя ўдарніцы брыгады: Цяцрунова Дуня, Малашкова А. і іншыя.

Сьцяпан Хвойка.

Магілеўскі раён.

Група мялышчыкаў і трапальшчыц калгасу „Авангард", Калышанскага с-с, Лёзьненскага р.

Рэспубліканскі плян збожжазагатовак выканан

Дабіцца „павышэньня тэмпаў загатовак па яшчэ нявыкананых відах загатовак, асабліва па ільну, бульбе, сену і саломе"

(З пастановы бюро ЦК КП(б)Б ад 5|I)

НІЯКАЙ ДЭМАБІЛІЗАВАНАСЬЦІ ВЫШЭЙ ТЭМПЫ ЗАГАТОЎЧАЙ РАБОТЫ

У жорсткай клясавай барацьбе з кулацкім сабатажам, з моцным супраціўленьнем клясавага ворага кулака атрымана перамога на фронце загатовак.

Рэспубліканскі плян збожжазагатовак выканан.

Пастанова ЦК УсеКП(б), якая прызнала зусім нездавальняючай ход загатовак па БССР, вызначыла цьвёрдыя тэрміны іх выкананьня і прынятыя ў сувязі з гэтым пастановы ЦК КП(б)Б і СНК БССР мабілізавалі ўсю партыйную арганізацыю Беларусі на неадкладнае выпраўленьне дапушчаных памылак, на бальшавіцкую арганізацыю барацьбы за збожжа, лён, бульбу, мяса, на рашучую ліквідацыю гнілых, лібэральных адносін да загатовак і супраціўленьня клясавага ворага і яго агентаў.

Былі прыняты рашучыя меры супроць тых раёнаў, сельсаветаў, якія злосна сабатавалі загатоўкі.

Рашучы ўдар па кулаку, цьвёрдазаданьніку, перараджэнцу, апартуністу—прывялі да посьпеху. Апошняя дэкада сьнежня дала па загатоўках больш за адну трэць гадавога пляну. Барацьба за загатоўкі зьявілася экзаменам партыйных, савецкіх арганізацый, для ўсяго савецкага актыву. Ня мала было выкрыта апартуністаў, здраднікаў партыі, ад якіх партыя ачысьціла свае рады. Адначасова вырас і загартаваўся новы калгасны і вясковы актыў.

Ня мала ёсьць жанчын-актывістак, якія змаглі выкрыць манэўры клясавага ворага, якія актыўна баруцца за загатоўкі. Аб некаторых з іх наша часопісь пісала. Гэта **Скавародкіна** з Лепельшчыны, **Каця Шурхаева** з Магілеўшчыны. Такіх ёсьць шмат. Наша задача замацаваць гэты новы вырасшы актыў на далейшую барацьбу за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў, на рашучую ачыстку калгасаў ад клясава-варожых элемэнтаў, на сваячасовую падрыхтоўку да вясеньняга севу. Неабходна арганізаваць гэты актыў на далейшую барацьбу за выкананьне пляну збожжазагатовак кожным раёнам, сельсаветам, калгасам і паасобным калгасным дворам, на павышэньне тэмпаў выкананьня тых відаў загатовак, якія яшчэ ня выкананы, асабліва па ільну, бульбе, сену і саломе.

Дэлегацкія сходы павінны быць перадавікамі ў барацьбе за канчатковую перамогу на фронце загатовак, у справе арганізацыі жаночых чырвоных абозаў ільну і бульбы. Большасьць ільнаводчых раёнаў яшчэ сваіх плянаў ня выканала. Асьвейскі, Сенненскі, Талачынскі, Бешанковіцкі, Сіроцінскі і Расонскі раёны цягнуцца ў хвасьце ільнозагатовак.

Справа гонару кожнай дэлегаткі,—кожнай актывісткі драцца за ліквідацыю адставаньня, за поўную перамогу над кулацкім сабатажам. Цьвёрдыя заданьні павінны быць абавязкова спагнаны.

Вышэй тэмпы загатоўчай работы.

Загатоўкі на рэйкі сацспаборніцтва

Па Слабодзкім сельсавеце, Заслаўскага раёну, праведзены жаночыя сходы, на якіх абгаварвалася пытаньне аб выніках нашай першай пяцігодкі і задачах другой пяцігодкі.

Жанчыны вёскі Слабада вынесьлі прапанову сустрэць другую пяцігодку новым сустрэчным плянам ільнозагатовак. Пастанавілі і выканалі. Здалі дзяржаве 35 кг ільну сустрэчнага і выклікалі на сацспаборніцтва жанчын вёскі Лашаны і Гарошкі.

Жанчыны вёскі Лашаны з задавальненьнем прынялі выклік і далі сустрэчны плян—64 кг ільну і выклікалі вёску Шчарбкі. Жанчыны вёскі Гарошкі прынялі выклік і здалі—35 кг ільну сустрэчнага.

Асабліва праявілі сябе актывісткі — бяднячкі з вёскі Гарошкі **Шымкевіч Ганна і Бельская Агата**, якія далі па 4 кг ільну і арганізавалі чырвоны абоз ільну, а таксама **Шалак Зося** з вёскі Слабада.

Жанчыны Слабодзкага сельсавету выклікаюць жанчын-калгасьніц і аднаасобніц астатніх сельсаветаў Заслаўскага раёну і другіх р-наў БССР пасьледваць іх прыкладу.

Сапраўды па-бальшавіцку сустрэць нашу другую пяцігодку новым сустрэчным плянам ільнозагатовак.

Заслаўскі раён. Сухацкая.

Ударніца калгасу імя Шубранава т. Пятрова выпрацавала 290 працадзён і атрымала 118 пуд. збожжа

Перараджэнцам, сабатажнікам загатовак ня месца ў ворганах дыктатуры пралетарыяту

Вельмі ўжо добры чалавек старшыня сельсавету Шакура Васіль. Дабрэйшага ўжо мусіць і ня знойдзеш. Ды, скажэце вы, добры да ўсіх роўна. Даведкі на млын, калі ласка, каму ўгодна і хто хоча. Кірыловіч Піліп—заможнік з вёскі Тросна (Чарнянскі сельсавет) сабатуе загатоўкі, не здае бульбу і лён. Ну, дык што-ж з гэтага, ці яму есьці ня трэба—так разважае Васіль Шакура і выдае яму даведку на млын.

Салдаценка Іван (вёска Тросна) для таго, каб сабатаваць загатоўкі, збожжа не малаціў, адлажыў надалей і разважае: „а можа абойдуцца і без мяне—не гарыць, завязу". Упаўнаважаны па гэтай вёсцы, той самы паважаны Васіль Шакура склаў акт і на гэтым супакоіўся. Вёска Тросна злосна зрывае загатоўкі. І ня дзіва. Калі даецца такая паблажка сабатажніку-кулаку і іншым прыхлябацелям.

Калгас „Новыя аўчыненкі", перш чым выканаць загатоўкі, разьмеркаваў лён па працаднёх, ну і плян вядома ня выконваецца.

— Як вы думаеце, тав. Шукара, задаюць яму пытаньне на партсходзе, калгас „Новыя аўчыненкі"—выканае ільназагатоўкі?

— Па маёй думцы, аўтарытэтна заявіў ён—ня выканае, бо ільну ў іх ужо няма.

Мяккае сэрца ў Шакуры, не хапае толькі сьлязы яшчэ.

Ня выкананы загатоўкі ільну і ў калгасе „Шлях пралетарыяту". Аўтухоў Антон — лічачы сабе вельмі разумным і добрым гаспадаром, пасылае падзоды за ўгнаеньнем, за дробнымі справамі ў Шклоў, толькі лён не дачакаецца сваёй чаргі ў гэтым калгасе.

— Хай дадуць падводы, тады паедзем—прад'яўляе Аўтухаў рахунак сельсавету, у той час як ёсьць цягавая сіла.

А як-жа на гэта глядзіць сельсавет. Сельсавет таксама чакае. Мусіць чакае „дапамогі".

Ня дарма-ж вясковы актывіст Сяргеяў Мікола па адрасу Шакуры кажа:

— Не з яго характарам ў савеце сядзець, якшаецца з кулакамі і падкулачнікамі.

Ня менш „добрыя" людзі і іншыя члены прэзыдыуму Чарнянскага сельсавету. Напрыклад, сакратар сельсавету Тарасаў і зараз яшчэ ня выканаў пляну загатовак—63 *кг* ільнавалакна, 1 цэнтнэр трасты.

Паспрабуйце, знайдзеце ў сельсавеце правільную апэрацыйную зводку па ходу загатовак, з агнём ня знойдзеце. На гэта апарат сельсавету відаць ня здатны.

— Некалі, бачыце, зводкамі займацца, вельмі заняты на працы,—кажа Тарасаў.

Верым... Верым. Ня лепш працуе і намесьнік старшыні Аўтухаў, ён-жа сакратар няіснуючай камсамольскай ячэйкі.

Ня прыкмеціўшы, ён адмячае мінулагоднія квітанцыі цьвёрдазаданьнікам.

— Я бачыце ня прыкмеціў, яны знаць былі падроблены, ня ведаю, як гэты Жукаў (упаўнаважаны РК) убачыў. Сапраўды добра, што Жукаў убачыў.

І гэта ўсё робіцца пад кіраўніцтвам кандыдата партыі—старшыні сельсавету Шакуро Васіля. Трэба адзначыць, што партячэйка ў адносінах Шакуро Васіля і працы сельсавету лібэральнічае. За такую працу Шакуро паставілі на від. Работа Шакуро Васіля зьяўляецца работай клясавага ворага, іначай расцэньваць ня можна яго патураньне кулаку-сабатажніку, антысавецкім элемэнтам.

Трэба неадкладна заняцца ачысткай сельсавету ад людзей, страціўшых клясавую пільнасьць, якія і да гэтага часу маюць партбілет у кішэні.

Шклоў. К.

Да адказнасьці зрыўшчыкаў загатовак з партбілетамі

За ўвесь 1932 год па Казловіцкім сельсавеце ня было ніводнага жаночага сходу. У часе гарачай рабочай пары многія калгасьніцы сядзелі па хатах з дзецьмі, бо ніхто ні ячэйка, ні сельсавет не паклапаціліся аб адчыненьні ясьляй і пляцовак.

У калгасе „Чырвоная ніва" з-за адсутнасьці жаночых рабочых рук лён пагніў на полі і плян па ільну калгас недавыканаў на 370 кілё.

Ячэйка апартуністычна недаацэньвае працу сярод жанчын. Вылучыла адказнага працаўніка за гэту галіну і лічыць, што астатняе ўсё само зробіцца.

Райком партыі павінен праверыць працу Казловіцкай партячэйкі.

Слуцкі раён. М.

Не застанаўлівацца на посьпехах, якія ёсьць Цалкам выканаць усе віды загатовак

Калгасьніцы калгасу „На варце" (Крычаўскі раён) прымаюць актыўны ўдзел у выкананьні загатовак усіх відаў. Агульны сход жанчын-калгасьніц, разам з аднаасобніцамі, які быў склікан спэцыяльна для абгаварэньня пытаньня загатовак, абвясьціў сябе мабілізаваным на поўнае выкананьне плянаў загатовак.

На другі дзень пасьля сходу кожны калгасны бядняцка - серадняцкі—аднаасобны „двор" здаў прылічваючыяся за квартальны плян мясазагатоўкі.

Галя.

Крычаў.

Калгасьнікі Юхноўскага раену (Зах. вобл.) здаюць лён

ГМБ Ср.-Аз.

Лісты работніц і калгасьніц

Просім убраць кулака

(Ліст дэлегатак)

Наш калгас імя Варашылава, Капыльскага сельсавету, арганізаваўся ў 1929 годзе і перажыў рад труднасьцяй. Два гады падрад у калгасе быў недарод, хлеба не хапала. У гэтым годзе калгас сваячасова справіўся з пасеўнай і ўборачнай. Хлеб урадзіўся добры. Датэрмінова і поўнасьцю калгас выканаў плян збожжазагатовак.

Даволі засталося хлеба для разьмеркаваньня па працаднёх. Кожная калгасьніца ведае, што той, хто працаваў, хлебам будзе забясьпечан.

Калгасьніцы задаволены вынікам працы калгасу гэтага гаспадарчага году.

Толькі перашкаджае ў працы калгасу і падрывае яе пралезшы ў калгас кулак Сянькевіч Павал. Да ўступленьня ў калгас ён быў абкладзен цьвёрдым заданьнем.

Зараз Сянькевіч зьяўляецца паляводам у калгасе. Праўленьне бяз згоды агульнага сходу прызначыла яго на гэту пасаду. Гэта зусім няправільна. Дэлегаткі на сваім сходзе высунулі на пасаду паляводa лепшую ўдарніцу—дэлегатку **Алесю Гурыновіч**, якая выпрацавала 315 працадзён, больш чым іншыя мужчыны, і ў поўнай меры з гэтай работай справіцца. Дэлегаткі патрабавалі зьняць Сянькевіча. Яны ўказалі на рад выпадкаў, калі Сянькевіч няправільна запісвае працадні працуючым калгасьнікам.

Бяднячцы **Мар'і Кот**, якая працавала з дня ў дзень, Сянькевіч не запісаў 2-х дзён працы. А сабе Сянькевіч акуратна кожны месяц запісвае па 31 працадню, незалежна ад таго—працаваў ён ці не.

У мінулым годзе па віне Сянькевіча была памарожана калгасная бульба ў капцох. На што быў складзен акт і перадан у суд. Але справа ня была вырашана, бо Сянькевіч меў моцнага абаронцу тав. Газава, які працаваў у райкалгассаюзе.

Дэлегаткі ўсе як адна выказаліся супроць паляводa—кулака Сянькевіча і просяць яго ўбраць з калгасу.

6 Па даручэньні дэлегатак напісала **Гаротная.**

Капыль.

Выгнаць прагульшчыкаў з прадпрыемстваў і ўстаноў

На многіх прадпрыемствах і ўстановах Любаньшчыны добра прапрацавана пастанова ўраду аб прагульшчыках. У выніку на райкамбінаце замацавалася да канца другой цяцігодкі 40 чалавек, у мясцкоме каапэрацыйных працаўнікоў—36 чалавек, у мясцкоме мэдсанпрацы—10 чалавек, будаўнікоў—40 чалавек.

Лепшая ўдарніца Кашынскага льнозаводу т. Нуліна (Маск. вобл.).

У саўгасе імя дзесяцігодзьдзя БССР пастанова ўраду прапрацавана па ўсіх цэхах. У трактарным цэху замацавалася да канца другой пяцігодкі 46 чал.

Апартуністычныя адносіны да прапрацоўкі пастановы мы наглядаем з боку мясцкомаў працасьветы, сувязі, дзяржаўных устаноў.

Усе прафарганізацыі раёну павінны разгарнуць работу па растлумачэньні пастановы ўраду з тым, каб яшчэ больш замацаваць працоўную дысцыпліну, разгарнуць сацспаборніцтва і ўдарніцтва, прэміяваць лепшых ударнікаў і бязьлітасна ўдарыць па гультаёх і прагульшчыках—зрыўшчыках выкананьня плянаў.

Алесь Шпакоўскі.

Любаньскі раён.

Трыкутнік фабрыкі „Спартак" павінен наладзіць работу дзіцячых устаноў

За апошні час на папяровай фабрыцы „Спартак" (Шклоў) павялічылася колькасьць работніц. Гэта абавязвае трыкутнік фабрыкі стварыць належныя ўмовы для паляпшэньня быту работніц, у першую чаргу паляпшэньня работы дзіцячых устаноў.

Што-ж мы маем на справе? Пры фабрыцы ёсьць ясьлі і ачаг, у якіх знаходзяцца амаль выключна дзеці рабочых. Фабрычныя арганізацыі ня цікавяцца работай дзіцячых устаноў. А там вельмі дрэннае забесьпячэньне, харчоў зусім мала.

Гэта, бязумоўна, уплывае на работніц.

Пасьля работы работніцы імкнуцца хутчэй забраць сваіх дзяцей і таму часта ня бываюць на сходах. Дзіцачыя ўстановы працуюць толькі ў адну зьмену, і работніца ня мае магчымасьці заняцца вучобай і грамадзкай работай.

Трыкутнік фабрыкі „Спартак" павінен зьвярнуць увагу на работу дзіцячых устаноў. Трэба перабудаваць яе і прыстасаваць да вучобы і грамадзкай нагрузкі работніц. Трэба палепшыць харчаваньне шляхам арганізацыі замазагатовак і стварэньня ўласнай харчовай базы.

Работніца.

Прагульшчыку і гультаю няма месца ў калгасе

Пры распрацоўцы пастановы ЦВК і СНК СССР аб звальненьні за прагулы бяз уважлівых прычын, калгасьнікі калгасу „1 мая" жорстка крытыкавалі лодыраў і прагульшчыкаў. Аднагалосна пастанавілі выключыць з калгасу гультайку-прагульшчыцу Шабека Матрону, якая сыстэматычна ня выходзіць на работу. У той час, як іншыя калгасьніцы працавалі, яна п'янствавала і гэтым самым разбурала калгас.

Прагульшчыку - гультаю няма месца ў калгасе.

Я. Кучур.

Слуцак.

Зьнішчыць адыход птушак

Раўняцца па ўдарніцах Шмаргуковай і Дзямяненкавай

Становішча птушкаводнай фэрмы саўгасу „Пяскі" (Гомельскі р ён) у мінулым годзе было надзвычай дрэннае. Ніхто не адчуваў адказнасьці за працу.

Раніцой птушніцы аддавалі корм птушкам і ўходзілі на цэлы дзень у горад. У выніку быў вялікі адыход, які склаў 93 проц. у адносінах да ўсяго пагалоўя. Птушкі раскрадваліся.

Сёлета, дзякуючы паляпшэнню кіраўніцтва саўгасу і ўкараненьню зьдзельнай сыстэмы зарплаты, мы маем пэўны пералом у рабоце фэрмы.

Разбазарваньне і раскрадваньне птушак амаль што ліквідавана поўнасьцю. Адыход птушак зьнізіўся да 40 проц, што таксама зьяўляецца яшчэ высокім процантам.

Сёлета фэрма ўкамплектоўваецца поўнасьцю птушкай у 6.000 галоў, з якіх 3.000 здаюцца Птушкатрэсту, 2.500 пойдуць на продаж, а рэшта для прыплоду. Кожная работніца ведае свае абавязкі і правілы догляду птушак.

Прэміяваная ўдарніца Шмаргунова згодна нормы павінна даглядаць 1 тысячу курэй ад 4—6 месячнага ўзросту, на справе-ж даглядае 1.500 куранят. Замест таго, каб прыходзіць на працу ў 7 гадзін раніцы, яна штодзенна прыходзіць у 6 і перш за ўсё аглядае сваіх куранят, а тады ўжо распачынае працу.

Птушніца-ўдарніца Дзямяненкава на фэрме працуе 5 месяцаў, да яе куры давалі каля 25 яек, а пры яе доглядзе пачалі даваць 35 штук.

Аднак, у рабоце птушкаводнай фэрмы ёсьць значныя недахопы. Яны выяўляюцца перш за ўсё ў неспрацаванасьці спэцыялістаў, якія працуюць на фэрме. Вэтэрынарны доктар т. Кузьняцоў не жадае лічыцца з птушкаводам Ізотавым, апошні ў сваю чаргу ня раіцца з Кузьняцовым і вельмі часта п'янствуе.

Як значны недахоп трэба адзначыць слабасьць палітыка-выхаваўчай работы як на фэрме, так і наогул сярод работніц саўгасу.

Птушкаводная фэрма саўгасу „Пяскі" да зімоўкі падрыхтавалася добра. Падрыхтавана цёплае памяшканьне для птушак. Гітушка поўнасьцю забясьпечана кармамі.

Перад кіраўніцтвам саўгасу стаіць задача—мабілізаваць работніц і рабочых фэрмы на барацьбу за поўнае зьнішчэньне адыходу птушкі, дабіцца большай адказнасьці ў рабоце.

Ведаючы.

Бяздушныя адносіны да дзіцячага саду

Калі мы ўвайшлі ў памяшканьне дзіцячага саду, то адразу ў нас склалася добрае ўражаньне. Пакоі чыстыя, сьветлыя, дзеці пад наглядам кіраўніц спакойна займаюцца сваёй дзіцячай работай. Але калі лепш прыгледзеліся, пагутарылі з кіраўніцамі і загадчыцай, мы ўпэўніліся, што ў садзе ня ўсё добра.

Ужо даўно пачаліся замаразкі, печы паляць, але шкло ў вокнах выбіта і цяпло прападае. Дзеці могуць лёгка прастудзіцца. Падлогі ў пакоях паламаны, патрэбен рамонт, але ўлетку ніхто аб гэтым ня думаў. Зараз у часе гульняў дзеці падаюць, бо ў падлозе ямы. Калі-ж кіраўніцтва саду зварачалася ў райАНА, каб адрамантаваць памяшканьне, то там сказалі: „Няма шкла і цьвікоў і мы вам нічога не дадзім".

Брыгада цікавілася і тым, як дзіцячы сад забясьпечан прадуктамі харчаваньня і як арганізаваны самазагатоўкі. Тут справа вусім дрэнная. Пры садзе ёсьць адкормачны пункт, але ён не забясьпечан кармамі.

У чым тут справа? Загадчыца саду энэргічна змагаецца за інтарэсы саду, але перашкода ў тым, што мясцовыя арганізацыі недаацэньваюць важнасьці дзіцячага саду.

Ёсьць многа сродкаў для забесьпячэньня саду, але вырваць гэтыя сродкі вельмі цяжка. Калі загадчыца саду зварачаецца ў мясцовы савет за грашыма, то ёй гавораць: „На што табе патрэбны грошы, мы ня ведаем навошта яны пойдуць, можа вы купіце дзецям цукерак і шакаляду".

Несваячасовая выдача грошай тармозіць бесьперабойнае забясьпячэньне саду прадуктамі харчаваньня і арганізацыю самазагатовак. З адпушчаных сродкаў не скарыстана яшчэ 5 тысяч рублёў, а сад ня мае за што купіць бульбы, тлушчаў і іншых прадуктаў.

РайАНА на сад не зварачае ніякай увагі. Ніхто з работнікаў райАНА ня цікавіцца, як працуе сад, у якіх ён умовах і што для яго патрэбна.

Мясцовы савет павінен неадкладна выдаць грошы дзіцячаму саду, бо зрываюцца загатоўкі прадуктаў харчаваньня і кармоў для адкормачнага пункту.

РайАНА неабходна зрабіць агляд работы дзіцячага саду, заслухаць справаздачу загадчыцы і адрамантаваць тэрмінова памяшканьне.

Брыгада дэлегатак: Шульман, Каплан, Ліпмановіч.

м. Капыль.

Рэдакцыя чакае тэрміновага адказу ад Капыльскай РКК РСІ, якія прыняты меры, каб зламаць бяздушныя адносіны з боку мясцовага савету да дзіцячага саду.

Збор птушак у калгасе „Чырв. Кастрычнік" для агляду ветурачом.

„Я зусім шчасьлівая“

Алеся Акуловіч

Алесю ведаюць усе суседнія калгасы, як лепшую калгасьніцу-ўдарніцу. Аб яе аўтарытэце сярод сваіх калгасьнікаў і гаварыць ня прыходзіцца.

Убачылі мы яе каля сушні. Быў абедзены час. Яна сядзела на кучы званенай каля сьцяны кастрыцы, трохі стомленая Адказны вучастак працы даверыў калгас Алесі Акуловіч. Яна зьяўляецца брыгадзірам у брыгадзе па апрацоўцы ільну.

Першая прыходзіць на працу і апошняя выходзіць з сушні.

Цяжкая работа сушка ільну, нават мужчыны ня хочуць ісьці на гэту работу. Дым і чад душыць. З вачэй коцяцца сьлёзы, пакуль пасадзіш лён, ці пакуль вынесеш яго з сушні.

Алеся, зьяўляючыся брыгадзірам, сама сушыць, выдае лён кожнай мяльшчыцы і потым прымае зьмяты.

Алеся самы папулярны чалавек у калгасе, асаблівай папулярнасьцю і пашанай яна карыстаецца ў масе калгасьніц. Заслужыла яна гэту папулярнасьць сваёй адданай працай. Алеся ня толькі сама добра, прыкладна працуе, але і вядзе за сабой усю масу калгасьніц.

Калі трэба сабраць жанчын на сход ці арганізаваць стопроцантны выхад іх на працу, то гэту справу даручаюць Алесі.

Усе памятаюць, як Алеся арганізавала жанчын для працы па сіласаваньні ў сьвяточны ды яшчэ ў храмовы дзень.

Алеся член праўленьня калгасу, яна заўсёды сваячасова ўказвае на паасобныя памылкі праўленьня і змагаецца за іх выпраўленьне.

Калі была закончана ўборка з палёў збожжа і іншых культур, то частка калгасьніц з-за нераспарадчасьці праўленьня хадзіла бяз працы. Жанчыны наведвалі праўленьне, пыталіся ў брыгадзіра „ці няма якой працы“, ім адказвалі „няма“. Алеся і тут прышла на дапамогу.

У калгасе ішла пасадка саду на вялікай плошчы. На капаньні ям для прышчэп былі заняты выключна мужчыны. Па прапанове Алесі Акуловіч была арганізавана група жанчын для гэтай работы.

За сваю адданую працу Алеся ўжо многа раз прэміявана. У дзень ударніка калгас прэміяваў Алесю ганаровай граматай ударніка.

Калі бывае, што паасобныя калгасьніцы скардзяцца на цяжкасьць працы, на дрэннае жыцьцё, то Алеся ўся загараецца. Яна фактамі свайго дваццаціпяцігадовага батрацкага жыцьця даводзіць усю жудасьць існаваньня бяднячкі-сялянкі, якую нэндза і голад прымушалі ісьці ў батракі.

— А зараз я жыву так, як калісьці толькі ва сьне марыла.

Алеся ўспамінае сваё батрацтва і сапраўды жудасная гісторыя былога батрацкага жыцьця, сёнешняй калгасьніцы — члена партыі з 1928 году Акуловіч, зьяўляецца тыповай наогул для малюнку бесчалавечнай кулацкай эксплёатацыі.

З сямі гадоў аддалі Алесю ў падпаскі.

25 доўгіх гадоў батрачыла Алеся. Мяняліся паны-гаспадары, не мянялася толькі жыцьцё Алесі. Праца цяжкая ад раньня за поўнач кожны дзень і 2—4 гадзіны сну.

Ні прасьветку, ні радасьці. Жаліцца ня было каму. Ад паноў літасьці не дачакаешся. Алеся ўжо гэта добра разумела.

І цяпер ня можа забыць, як, у часе працы ў кулака, загарэліся валасы каля печы, калі яна, змораная сыстэматычным недасыпаньнем і цяжкай працай, схіліла галаву на прыпечак і задрымала. Быў нечалавечны боль, але Алеся баялася сваёй гаспадыні, нават не сказала нікому аб гэтым.

Цёмная, забітая працай яна з боку паглядала на жыцьцё. І калі ў 1925 годзе ў першы раз папала на сход батракоў, дзе гаварылі аб уступленьні ў саюз, аб узаемаадносінах батрака і гаспадара, Алеся многа зразумела. „Мне сказалі,—гаварыла Алеся,—што гэты прамоўца—камуніст. Я зусім ня ведала, хто такія камуністы. Мне здавалася, што камуністам можа быць толькі багаты“. Потым саюз, звальненьне з працы—кулак баяўся саюзнай. Далей частыя батрацкія сходы. Потым у 1928 годзе ўступленьне ў партыю і там актыўнае самаадданае змаганьне за перабудову вёскі на сацыялістычны лад, за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасу.

Алеся сьмяецца цяпер, калі ўспамінае, якімі хітрыкамі кулакі хацелі яе купіць. Кулачка Мысьліцкая—былая гаспадыня Акуловіч, баючыся, што Алеся раскажа ў прафсаюзе аб зьдзеках над ёю, абяцала ёй купіць сукенку і шалік.

Кулак Булат прапанаваў Алесі выйсьці замуж за яго сына. Ёй адкрыта ён сказаў,—„ты камуністка і таму можа нас не раскулачаць, калі ты будзеш у нашай сям'і“.

Алеся яму пьвёрда адказала: „Пашукай свайму сыну другую камуністку, але я ўпэўнена, што ты яе ня знойдзеш. Мне твой сын не патрэбен“.

З вялікай ахвотай Алеся ўспамінае момант, калі яна раскулачвала свайго былога гаспадара—кулака Мысьліцкага. Пані Мысьліцкая, зьбянтэжаная, кінулася да Алесі.

— Алеська, ты мая даражэнькая, хіба-ж у цябе бога няма, хіба-ж у цябе сэрца няма,—прыказвала пані.

Алеся рабіла сваю справу, яна, член партыі, ужо цьвёрда ведала, што выконвае дырэктыву партыі аб ліквідацыі кулацтва як клясы і прыказваньні пані зусім не краналі яе сэрца.

— Адно толькі я і сказала,—гаворыць Алеся,—што прышоў і ваш канец, годзе вам піць кроў батрацкую.

Алеся—ударніца калгасу „Чырвонаармеец“, з жудасьцю ўспамінае гады свайго батрацтва.

— У калгасе мне вельмі добра, я зусім шчасьлівая. Вось словы, якія ад сэрца гаворыць Алеся Акуловіч.

Усё яе жыцьцё гаворыць, што вы маеце справу з новым чалавекам, тым, якога стварыла наша Савецкая рэчаіснасьць. Алеся Акуловіч сапраўды зьяўляецца гэтым новым чалавекам. Толькі Алеся павінна памятаць, што ёй трэба вучыцца, абавязкова вучыцца.

Кандратава.

Члены сельсаветаў, працуйце так, як Волкава Эміля

Вёска Рублёва (Лёзьнянскі раён), якую абслугоўвае член сельсавету Волкава Эміля, стала аднэй з перадавых. Членам сельсавету Волкава працуе зусім нядаўна, некалькі месяцаў, але, дзякуючы ўпартай бальшавіцкай барацьбе за выкананьне гаспадарча-паліцычных кампаній, яна дабілася на сваім пункце значных посьпехаў. За якую-б галіну працы Волкава ні бралася, яна даводзіць яе да канца. У выніку вёска Рублёва ў другую пяцігодку ўступіла з выкананьнем і перавыкананьнем плянаў загатовак і мабілізацыі сродкаў.

Абавязковыя плацяжы — сельскагаспадарчы падатак па вёсцы Рублёва—цалкам выплачаны.

Данае заданьне па распаўсюджаньні пазыкі „чацьверты завяршальны“ ў 200 руб. перавыканана на 30 руб.

Плян ільназагатовак у 10 цэнт. выканан на 100 проц., па ільнасемі—100 проц., збожжы—100 проц., бульбе—100, сене—112,3, мясе—104,8 проц.

Два цьвёрдазаданьнікі, якія ёсьць у в. Рублёва, даўно ўжо выканалі свае пляны па ўсіх відах, бо Волкава не давала спакою, штодзенна правяраючы выкананьне.

Гэтых посьпехаў Волкава дабілася таму, што правільна расставіла сілы на вучастку, добра і ўмела кіравала. Камісія садзейнасьці кіравала выразна, кожны член камісіі адказваў за даручаны вучастак работы, добра наладжаны ўлік працы—вось вагары, якія спрыялі дасягнутым посьпехам.

Чырвоныя абозы, якія арганізоўваліся ў сельсавеце, не праходзілі бяз удзелу вёскі Рублёва, бяз удзелу Волкавай. Быў выпадак, калі ў некалькіх сялян вёскі Рублёва ня было абмалочанага збожжа, каб прыняць удзел у чырвоным



Пераапрацоўка льнотрасты ў Кручкаўскім сельсавеце (Маскоўск. вобл.).

абозе. Волкава абыходзіла хаты сялян і растлумачвала аб неабходнасьці прыняцьця ўдзелу ў чырвоным абозе, у выніку сяляне ішлі малаціць, а раніцой пасьпявалі са змалочаным збожжам у чырвоны абоз.

Волкава сама па некалькі раз бывае ў кожнага селяніна, асабліва там, дзе трэба растлумачыць, дабіцца выкананьня. Слабы вучастак вёскі заўсёды ў яе пад непасрэдным наглядам.

У тых выпадках, калі ў Волкавай былі непаладкі і непаразуменьні, яна звярталася за дапамогай у сельсавет, ці партячэйку, дзе заўсёды атрымлівала парады і дапамогу.

У лістападзе Волкава ўступіла ў рады партыі. Яна заявіла, што яшчэ з большай настойлівасьцю будзе змагацца за выкананьне задач, пастаўленых партыяй у другой пяцігодцы.

Лёзна. А. К.

Работніцы арганізавалі збор у фонд другой пяцігодкі

Работніцы сталоўкі і трусатніка Крычаўскага цэмэнтнага заводу падрыхтаваліся да 1 студзеня—першага дня другой пяцігодкі.

На сходзе пастанавілі арганізаваць збор у фінансавы фонд другой пяцігодкі. Усе падалі заявы аб вылічэньні з іх зарплаты за сьнежань пэўнай сумы ў фонд другой пяцігодкі. Ніжэй мы друкуем прозьвішчы гэтых работніц і суму, на якую яны запісаліся.

Сотнікава—запісалася на 25 рублёў. Харчанка, Ліпічэнка, Трашына, Вароніна З., Якубоўская, Сарокіна, Мэтман запісаліся па 10 руб. кожная. Вароніна В., Сергіевіч, Мацюшонак, Лупіцкая, Воўк, Кляўсава, Сізьлік, Завадзкая, Скочка, Іванова, Катэлёва Таня, Сапега—па пяць руб. кожная.

Работніцы выклікалі пасьледваць іх прыкладу працуючых у гэтых установах мужчын, у выніку чаго сума фонду другой пяцігодкі складае 282 руб.

Гэты пачын павінны падхапіць усе работніцы працоўныя жанчыны БССР.

Крычаў. Галя



Калгасьнікі калгасу „Шлях да новага жыцьця“ атрымоўваюць авансы збожжа.

ЯЗЭП ШТЫЛЬ

(працяг)

Тры дні на балоце былі цэлай эпохай. За работай Марфы і Ягоркі Скабы, за работай Прыходзькі сачылі ўсе рабочыя. Кожнага цікавіла, што выйдзе з гэтай нязвычайнай выдумкі. Адны накшталт Піліпа былі перакананы, што нічога ня выйдзе, што толькі больш папсуюць машыну. Дзе там бабе зрабіць што-кольвечы з такім складаным мэханізмам.

— Бабская справа вядомая,— разводзіў свае тэорыі Піліп,— радзі і даглядай дзяцей, сачы за гаспадаркай, а далей носу ня суй! А вось Дубовічыха пасунула нос. І ўвязьла! Машыніст? Гэта ня жартачкі. Пакоўзалася, пакоўзалася дый зламала машыну.

— Але-ж яна ў апошнія месяцы давала лепшыя паказальнікі за іншых,—пярэчыў хто-небудзь з моладзі.

— Паказальнікі!—гіранічна адводзіў Піліп гэты доказ, як ня варты нават увагі.—Паказальнікі! Падумаеш якая справа даць паказальнікі, калі машына спраўная. Няхай яна цяпер іх дасьць. І Піліп перапыняў гутарку, лічачы пытаньне вычарпаным і, паважна насунуўшы шапку на вочы, ішоў да сталовай.

Другія, што пярэчылі людзям падобным да Піліпа, з затаёным дыханьнем чакалі канца работы. Вярней, яны не чакалі, а рабілі ўсё магчымае, каб закончыць рамонт, каб хоць чым дапамагчы Марфе, Ягору і інжынэру. Калі здавалася, што балота сьпіць, што яго спакой не парушае аніводны чалавек, ля рэчкі, паціху перамаўляючыся, стаялі рабочыя. Многія з іх нават ня важыліся ўвайсьці ў машыну, каб чым небудзь не перашкодзіць. Стаялі і слухалі, як зьвініць жалеза, скрыгоча падпілак ды сьвішчуць мяхі невялічкага гарна. Слухалі з выключнай увагай, слухалі нібы якую сусьветную славутасьць— музыку ці сьпевака. Слухалі і па гуках здагадваліся аб ступені, на якой знаходзіцца рамонт, па кароткіх адрыўках фраз Марфы, Скабы, Прыходзькі, што да іх даляталі, судзілі аб посьпеху.

Другія, закасаўшы рукавы, разам з „паўночнікамі", як празвалі ўдзельнікаў рамонту, набліжалі тэрмін сканчэньня.

І памыляўся той, хто думаў, што ў гэтыя тры ночы, якія былі цэлай эпохай, спала балота. Яно жыло бяз шуму і гвалту, без галасістага ляску і песень. Жыло ў крапатлівай і цяжкай рабоце. Калі быў скончан рамонт, людзі сышліся да машыны, як да чалавека, што быў небясьпечна хворы і раптам нечакана ўзьняўся на ногі і сказаў, зварачаючыся да ўсяго сьвету:

— Глядзеце, які я здаровы!

Аглядалі і песьцілі машыну. А яна стаяла моўчкі, узьняўшы ў гару дзюбу чарпак, гатовую з ярасьцю ўрэзацца ў зямлю. Стаялі людзі і чакалі першага ўздрыгу, першага руху машыны.

— Пайшла, пайшла!— рэхам разьнесьліся па балоту першыя словы радасьці і перамогі.

— Пайшла! — адгукнулася ў лесе.

— Пайшла!—паўтарыла сьледам Марфа і ветлівая ўсьмешка асьвятліла яе твар.

— Пайшла!—сказаў Піліп і насунуў яшчэ больш шапку на вочы.—Пайшла, каб яна згарэла...

Ён ішоў у рабочы камітэт, каб застаць каго-небудзь з працаўнікоў і падаць заяву ва ўдарнікі. Хоць і пусьцілі яго з міліцыі, хоць і знайшлі, што ён не вінаваты, але ўсё-ж было небясьпечна. Трэба крыху падфарбавацца, перабудавацца—думаў Піліп і ніяк ня мог пагадзіцца з думкай, што яго апярэдзіла, здужала баба.

Чалавек век жыў, лічачы сябе разумнейшым і мацнейшым за ўсіх, а тут на табе, баба нагамі патаптала яго работу. Піліп яшчэ больш узьненавідзеў Марфу і яе чорныя глыбокія вочы, яе постаць, тонкія хударлявыя рукі, узьненавідзеў ухмылку, упэўненую мужчынскую хаду, сьмеласьць і задзірлівасьць і гэтае пачуцьцё пераваг над ім, над Піліпам.

Захацелася адпомсьціцца бабе-д'яблу, даказаць, што яго, Піліпа, голымі рукамі ня возьмеш, што ён можа пастаяць за свой гонар, за права на жыцьцё. У грудзёх клекатала, падпірала пад сэрца, нешта такое безназоўнае, такое, што і слоў не падбярэш, выразаў ня знойдзеш. Здаецца, каб папала ў тую хвіліну на вочы Піліпу Марфа, замахнуўся-б і ссадзіў з ног, каб ня ўстала, каб сваёй уласнай, паганай крывёю абмылася.

Вось што было ў грудзёх у Піліпа. Цягнуўся ён мернай хадой, узьняўшы ў гару галаву і ўставіўшы вочы ўдалеч, пакуль зрокам не напаткаў міліцыянэражанчыну, што вартавала мост праз канаву. Зірнуў на яе і вочы яшчэ больш загарэліся помстай, але калі ўспомніў, што вось гэта на яго погляд нікчэмная жанчына, мае сілу, якой ня здужаць Піліпу, зьмяк.

У Піліпа быў брат гадоў на пяць малодшы за яго. У 1914 годзе Андрэя—так звалі брата Піліпа—забралі на вайну. Праз год

з дапамогай бацькі Андрэй стаў вахмістрам у казацкім гусарскім палку. У 1916 годзе атрымаў „Георгія“ першай ступені і чын падпаручніка. Праз 6 месяцаў Андрэй ужо быў капітанам і камандаваў батальёнам. Рэвалюцыя спыніла яго прасоўваньне ўгару, перарэзала дарогу да палкоўніцкіх эпалетаў, разьбіла мары такія цудоўныя, сьветлыя, прыгожыя, як у дзіцячых снох.

І пайшоў Андрэй па другіх сходах. Быў:

Паручнікам у Каледзіна.
Капітанам у Карнілава.
Падпалкоўнікам у Дзянікіна.
Атаманам у Балаховіча.

Хаваў Піліп Андрэя ў лазьні тыдняў з тры пасьля таго, як пад Мозырам чырвоныя канчаткова разьбілі банду Булак-Булаховіча. Хаваў ды не ўхаваў. Данесьлі суседзі. Аднойчы пад вечар прыехалі з Мозыра ўтраіх, а з імі вось такая бялявая, віхрастая, як гэта міліцыянэр-жанчына. Высунулася яна наперад, гуляючы „маўзэрам“.

— А ну, голубе, кажы дзе брат—балаховец-афіцэр, дзе ты яго схаваў?

— Ды ў мяне і брата ніякага няма—прабаваў адгаварыцца Піліп.

— Андрэй хіба ня твой брат?

— Мой, але-ж яго забілі...

— Брэшаш! Ён яшчэ пакульшто жыве, тут ён, на хутары, больш няма дзе яму быць.

І пайшлі шукаць. Абступілі хутар, а як сталі падыходзіць да лазьні, заляскаў Андрэй з нямецкага „маўзэра“. Зьняў першай куляй яшчэ зусім маладога бязвусага камсамольца з пад Пятрыкова.

— Лажыся!—закрычала дзяўчына.—Агонь!

Гадзіну не сунімалася страляніна. Страляў атаман-афіцэр да апошняга патрона. Як угледзеў, што няма выйсьця, падпаліў лазьню, каб, захутаўшыся дымам, уцячы, але ня ўлічыў атаман спрыту чырвоных. Кінуўся ў лазьняк, ды там і звалiўся, скануў.

Зірнуў Піліп на дзяўчыну-міліцыянэра і зьмяк. Яна страшэнна нагадвала тую, што падрэзала ў лазьняку брата Андрэя. Бялявая, віхрастая, сьмелая. А можа яна?—нібы хто сказаў. Яна!—у думках паўтарыў Піліп.—А што калі яна спазнае, не паздаровіцца Піліпу—брату афіцэра? І жах апанаваў Піліпам. Ён ня чуў, як самі павярнулі ногі ў другі бок, не агледзеўся, як пабег наўсьцяж рэчкі да свайго хутара...

* * *

На Марфу часта прыходзілі паглядзець, а потым і пагаварыць, папытаць рады па жыцьцёвых пытаньнях, жанчыны з вакольных хутароў. Слава аб яе гераічным учынку абляцела хутары, вёскі і пасёлкі Палесься. Многія яшчэ ня ведалі, як жанчына ды магла выратаваць сапсутую ворагам замежную машыну. І тыя, што ня верылі, проста ішлі зірнуць хоць раз на Марфу, як на якога заморскага зьвера.

Вось гэта баба, дык баба,—гаварылі кабеты, пытаючыся, як знайсьці Марфу Дубовічыху. А калі знаходзілі, няёмка пераступаючы з нагі на нагу, патупляючы вочы ў зямлю, бо і глядзець асабліва ня было на што—звычайная жанчына,—чакалі, ня ведаючы з чаго пачаць. Вясёлая, жыцьцярадасная, ужо крыху стараватая, ветлівая, працавітая, энэргічная, усьміхалася Марфа. Прышоўшыя ў гэтай усьмешцы бачылі саміх сябе, бачылі непадкупную прастату, адчувалі ў Марфе нібы сястру, нібы родную маці.

— Ці-ж вы да мяне, жанчынкі?

— А мы так,—нерашуча пачынала байчэйшая з усіх,—чулі, што ты, цётачка, нейкая нязвычайная, як-бы табе сказаць. Вось і прышлі паглядзець на цябе, пагаварыць.

— Бачыце, няма ў мяне нічога нязвычайнага. Так як і ўсе жанчыны, мужа мела, дзяцей радзіла, але не пашанцавала...

Чулі, галубка ясная, чулі. Ня трывож сябе, гэтым не дапаможаш,—супакойвалі госьці Марфу, калі яна, успамінаючы пра мужа, пра Васілька, не магла стрымацца, каб ня ўсхліпнуць.

І завязвалася гаворка. Марфа канчала работу, звала жанчын да сябе. І сядзелі, пакуль ня зьмеркне, пакуль зоры ня ўсеюць неба.

Кожная з гасьцей-жанчын выходзіла ад Марфы з пачуцьцём асаблівай павагі і ласкі да гэтай ветлівай жанчыны. Дзесяткі з іх упяршыню па парадзе Марфы ўзяліся за кніжкі, за лемантар, узяліся за сваіх мужыкоў, пацягнулі іх да калектыўнай гаспадаркі, бліжэй да машыны, да лепшага жыцьця. Тая, што калісьці першай прышла да Марфы—Уліта Сіўцова з хутара Ямкі,—каб паглядзець на яе, як на нешта нязвычайнае, зараз трактарыстам езьдзіць, паласуе Палескую зямлю, выварочвае адвечныя карэньні, сеючы новае ў гэтых балотных і лясістых мясцох.

А Марфа арганізавала гурток па вывучэньні тэхнікі. Займаецца з чорнарабочымі, з памочнікамі машыністаў, з качагарамі. Выступае на сходах, робіць даклады, рыхтуецца ўступаць у партыю, рыхтуецца сама вучыцца. І празвалі на балоце Марфу за яе моцныя, простыя і дзелавыя выступленьні, за яе бязупыннную, вястомную работу — агіцірніцай. Так і завуць яе цяпер—Марфа Агіцірніца.

* * *

—Прышла агіцірніца,— сказаў Піліп, які ня стрымаўся, каб ня прыйсьці на заняткі,—прышла дурманіць нашыя авечыя галовы!—Сказаў і адвярнуўся, расьцягнуўся на траве, падставіў твар пяшчотам сонца, зрабіў выгляд, што сьпіць. Нават носам колькі раз задаў храпака. Рабочыя канчалі палуднаваць. Здалёк даносіліся сьвісткі і хрып экскаватара.

Да рабочых падышла Марфа. Прывіталася. Села на мураве. Сёмка Каршэнь палез у торбачку. Доўга там калупаўся і дастаў сшытак.

— Ну, дык мабыць пачнем, навошта марудзіць. Час ідзе, нас не чакае. Глядзі, праз паўгадзіну на работу трэба станавіцца.

Шмат трэба было часу і намаганьняў, каб укласьці ў вусны Сёмкі гэтыя словы. Сёмка яшчэ зусім нядаўна быў пад моцным уплывам Піліпа—навошта машына, былі-б рукі, а кавалак хлеба заўсёды заробіш!.. Час і намаганьні Марфы перамаглі і тут.

Толькі Піліп ды яшчэ з пару людзей не прызнавалі Марфу і яе „бабскага“ вучэньня. Гэтыя людзі—прыхвасьні Піліпа—звалі свайго вярхавода Піліпам Міходычам, падтаквалі яму, калі ён расказваў свае гісторыі.

— Што яна гародзіць лухту! Патрэбна мне тая машына? Мне жыць трэба, а тут машына. З машыны сыты ня будзеш,

На машыну спадзявайся ды сам не плашай.

І аб грошах:

— Дадуць табе шапку грошай, а што з іх толку. Ці-ж ня праўду я, кум, гавару? Скажы?

— Праўду, а як-жа, Піліп Міходыч, праўду, што і казаць.

— Грошы, на што яны здаліся! Мне неяк кум гаварыў, што раней, ну, мабыць, сто таму назад, мабыць, дзьвесьце...

— А мабыць і тышчу!—уставіў слоўца Гаўрылка Кулямёт.

— Мабыць і тышчу, праўду, браце, кажаш. Мабыць і тышчу. Дык пра што гэта, значыць, я гаварыў?..

— Пра грошы, знацца, Міходыч.

— Так, так, пра грошы. Мабыць, тышчу таму назад, казаў мне кум, што за тры рублі можна было купіць каня—Піліп загнуў вялікі палец,—карову—загнуў другі і так па чарзе—цялё, авечку адну, авечку другую, барана, сьвіньню адну, сьвіньню другую...

— І такую як ты—трэцюю—сабануў, раптам падышоўшы ззаду трактарыст Дунонаў.

— Гады, пагаварыць з людзьмі не даюць! Што, мабыць, за шпіка падаслалі? Моў, тав. Дунонаў, праверце, якую там Піліп агітацыю разводзіць, куды ён цягне, што і як... Я, брат, ведаю, што вы за малайцы. Не ашукаеце. Ну, чаго ты, жывёла, вачыма лыпаеш?!—закрычаў раптам Піліп,—чаго зубы скаліш, чаго бялкамі круціш?

Плюнуў, расьцёр нагой і зрабіў пару крокаў, але, напаткаўшы зрокам групу рабочых, што акружылі Марфу, вярнуўся назад.

— Я табе, сволачы такому, проста скажу: на чорта мне грошы здаліся, калі я за іх нават шклянкі гарэлкі купіць не магу! Вось табе і ўвесь сказ. Так і перадай начальству. Моў, Піліп гарэлкі хоча, а яе нідзе няма. А таму кажа, на якога блазна яму грошы. І работу кабыле пад мокры хвост.

— У мястэчка схадзі. Там, кажуць, ёсьць колькі хочаш. Нават утапіцца можна. Недалёка, якіх вёрст сорак будзе, ня болей. Ногі ў цябе прыткія. Бярозавы кандуктар у рукі ды сядай на адзінаццаты нумар—і гайда.

— А ты думаеш не пайду? Што, можа ня пусьціце? Я чалавек, брат, вольны—куды захачу, туды і палячу.

— Ну, а калі з прафсаюзу выключаць?

— Ай-яй-яй! Перапалохалі! Вось задасьцё перцу, як той заяц кабыле! Выключаць, кажаш? Мой профсаюз там, дзе я. Цяпер, брат, не такія часы. Былі-б рукі, прафсаюз знойдзецца. Мы пісьменныя, разумеем, што да чаго...

Невядома дакуль цягнулася-б гэта перастрэлка, каб не паклікалі Дунонава да гурту...

Дунонаў, пакінуўшы Піліпа і яго кампанію, падышоў да хлапцоў, якія прагна лавілі кожнае сказанае Марфай слова, крэмзалі пагрызанымі алоўкамі ў сшытках, Марфа, стоячы на каленях, пытала ў крайняга белагаловага хлопца.

— Скажы, Міхасёк, якое значэньне мае пара для паравой машыны, ну хоць-бы для нашай—і Марфа рукой паказала на маўклівую зямлячарпалку, што недалёка стаяла на рэчцы.

Зацягнула рэчку чаротамі, асотамі. Заблыталіся яны тут, як валасы ў пінскім каўтуне. Перагарадзілі рэчку жывой і моцнай загародаю. Зацягнулі гэту калісьці вясёлую красуню тваньню. А вакол багна і ні межаў ёй, ані краю.

Лес тут расьце худасочны, невялікі, як сухотны чалавек. Вясной і ўвосень балоты заліває вадой. Адкрываюцца суцэльныя прасторы вады. З берагу берага ня відаць. Мабыць, на дзесяткі кілёмэтраў расьцягнуўся стэп-блакітны. Гэта карціна парушаецца толькі дзе-ні-дзе раскінутымі кустамі хмызьняку.

Невялічкія выспы прытуліліся сярод лесу. На выспах хібаркі, куранi. І тут-жа шматок ускалупанай зямлі, ды яшчэ крыха на суседнім востраве. Маленькія павеці. Пад павецямі драўляныя сошкі, сані. І зусім ня відаць калёс. Селянін-паляшук не адчувае ў калёсах патрэбы. З суседняга востраву сена або снапы ён перавозіць узімку, калі маразы закуюць балоты і сьнежныя завеі пракладуць шырокія дароґ. А так—багна, твань.

(Працяг будзе)



Мэханічна-зборачны і інструмантальны цэхі Чалябінскага трактарнага заводу

Тэма 2: Баявыя хэмічныя матэрыі і сродкі іх прыстасаваньня

(Працяг)

Хлёр

Хлёр упяршыню быў ужыт 22 красавіка 1915 г. у бойках на рацэ Іпры немцамі. Але посьпех меў толькі ў першыя дні яго ўжываньня. Гэта тлумачыцца тым, што ад хлёру вельмі лёгка хаваuца, ад яго захоўвае любы супроцьгаз. Таму хлёр хутка страціў сваю баявую каштоўнасьць, як атрутная матэрыя. Але трэба адзначыць, што ён у будучых бойках адыграе вялікае значаньне, бо ўваходзіць у склад амаль што ўсіх атрутных матэрый. Апрача таго хлёр разам з вапнаю дае хлёрыстую вапну, якая ўжываецца як дэгазатар некаторых атрутных матэрый.

Хлёр зьяўляецца газам, які мае жоўта-зялёны колер. Хлёр едка ўдушаючы, ён цяжэйшы за паветра ў 2,45 раза, таму пры пуску запаўняе ў першую чаргу нізіны. Пры атмасфэрным ціску, калі тэмпэратура—34°, хлёр пераходзіць у вадкі стан, што мае вялікае значэньне для перавозкі.

Хлёр вельмі добра рашчыняецца ў вадзе і пры злучэньні дае саляную і хлёраватістую кіслату.

Саляная кіслата вельмі ўплывае на мэталі, апошнія ржавеюць. Сухі хлёр зусім ня ўплывае на мэталі. Гэта мае вялікае значаньне для захаваньня яго. Хлёр таксама дзейнічае на вопратку. Гэта тлумачыцца тым, што хлёр з вільгацьцю дае саляную кіслату, якая разьядае вопратку. Для распазнаваньня хлёру ў паветры ёсьць дзьве паперкі: ёда-крухмальная паперка, якая ад прысутнасьці хлёру сінее і флюорасьцінавая, якая ружарее ці чырванее.

Калі есьць 0,1—0,2 міліграма хлёру на 1 літар паветра, то гэта выклікае вялікі кашаль, а пры 0,3 міліграма спыняецца доступ паветра ў лёгкія і чалавек памірае.

Здабываецца хлёр з павараной солі, якая рашчыняецца ў вадзе, а потым праз раствор прапускаецца электрычны ток. Павараная соль ад электрычнага току раскладаецца на натры і хлёр. Натры з вадою дае едкі натры. Едкі натры выпарваецца і паступае для мылаварэньня. Пры гэтым яшчэ выдзяляецца вадарод, які напампоўваецца ў балёны і ідзе для далейшага скарыстаньня.

Атрыманы хлёр прапускаецца праз серкавую кіслату, прасушваецца, пераводзіцца ў вадкасьць, а потым разьліваецца ў балёны і ідзе па прызначэньні. У мірны час хлёр таксама шырока ўжываецца для барацьбы са шкоднікамі сельскай гаспадаркі.

Фасген

Фасген ужывалі ў імпэрыялістычнай вайне ў нарадах і газамётах. Газамёты выбухалі праз электрычны ток. Фасген ёсьць газ, які ня мае колеру. Пах яго падобен да паху прэлага сена. Сам фасген у 3,5 раза цяжэй паветра і ў 1,5 раза цяжэй вады. Трэба адзначыць, што газ фасген вельмі прыліпчывы і доўгі час пасьля нюханьня здаецца, што ён увесь час акружае нас. У вадзе фасген рашчыняецца слаба. Ён добра рашчыняецца ў тулуоле пры 12 градусах цяплыні. 1 аб'ём тулуолу рашчыняе 240 аб'ёмаў фасгену, і адзін аб'ём кселолу рашчыняе 460 аб'ёмаў фасгену. Пры злучэньні з вадою хлёр дае саляную кіслату і вокісь вугляроду. Таму сыры фасген, маючы ў сваім складзе вільгаць, разьядае мэталі, дае глыбокую ржаўчыну. І таму пры захаваньні ў балёнах фасген абавязкова павінен быць сухім. Захоўваецца фасген у мэталёвых балёнах. Ужываецца ён у мінах, балёнах. Прысутнасьць у паветры фасгену можна пазнаць праз паперу Пракоф'ева. Гэта белая паперка пры дзеяньні фасгену становіцца жоўтай. Дэгазаваць у лябараторных умовах можна вадой, содай і поташам. Ад фасгену захоўвае любы супроцьгаз. Каштоўнасьць фасгену тая, што ён здолен уплываць на арганізм чалавека і выклікаць сьмерць нават на працягу некалькіх дзён пасьля атручваньня.

Дыфасген

Дыфасген—атрутная матэрыя, якая хаваецца ў вадкім стане. У баёх ён ужываецца ў стане пары. Сам фасген цяжэй за ваду ў 1,7 раза і цяжэй паветра ў 6,9 раза. Вадкасьць дыфасгену мае цёмна-буры колер. Хэмічна-чысты дыфасген зусім ня мае колеру, або чуць жаўтаваты. Пах дыфасгену такі-ж самы, як і фасгену, толькі больш рэзкі. У вадзе дыфасген рашчыняецца вельмі слаба. Але добра рашчыняецца ў арганічных растваральніках: кселоле і тулуоле. Хаваецца дыфасген у мэталічных пасудзінах. Для таго, каб дыфасген ня дзейнічаў на мэталі, да яго дадаецца фэнон, або карболавая кіслата.

Дыфасгенам начыняюцца знарады, міны, авіяцыйныя бомбы. У будучай вайне дыфасген будзе ўжывацца разам з іншымі атрутнымі матэрыямі. Распазнаваць яго можна па паху і паперцы Пракоф'ева. Ахоўвай ад яго служыць супроцьгаз. Для дэгазацыі ў лябараторных умовах ужываецца аміяк і шчолач.

Пры распрацоўцы гэтай тэмы трэба карыстацца наступнай літаратурай: Кісялёў—„Галоўнейшыя баявыя атрутныя матэрыі", стар. 32—49 і 52—55; Глінчыкава—„Клініка і тэрапія паражэньня баявымі матэрыямі", стар. 66—71.

XV гадавіну Чырвонай арміі сустрэнем новымі дасягненьнямі ў справе ахопу шырокіх мас працоўных жанчын ячэйкамі Асоавіяхіму ў справе ажыўленьня працы ячэек

Паўгектара ў падарунак пагранвойскам

Калгасьніцы калгасу „Новы шлях“ (Дрысенскі раён) у мэтах ажыцьцяўленьня шэфства над войскамі пагранаховы, сабралі 100 руб. і аддалі іх на пабудову калгаснай заставы.

Калгасьніцы абавязаліся ў 1933 годзе апрацаваць паўгектара гароду ў падарунак пагранвойскам.

Калгасьніцы іншых прымежных раёнаў, па прыкладзе калгасьніц „Новага шляху“ мацуйце абароназдольнасьць нашай краіны.

М. Я—ка.

Дрыса.

Наладзіць работу школьнай ячэйкі Асоавіяхіму

У 1-ай аб'яднанай ШКМ (Слуцкі раён) яшчэ з пачатку навучальнага году была арганізавана ячэйка Асоавіяхіму, у якую запісалася больш 300 вучняў.

Зараз прайшоў ужо не адзін месяц, а ячэйка не распачала работы. Ня было ніводнага сходу ячэйкі, апрача арганізацыйнага, на які зьявілася 20—30 проц. членаў.

Членскія ўзносы з членаў ячэйкі ня зьбіраюцца. Камсамольская ячэйка школы мала ўвагі аддае наладжаньню работы ячэйкі АСО.

Сярод вучняў не праводзіцца ніякай растлумачальнай работы наконт абароны краіны. Старшыня ячэйкі Асоавіяхіму бязьдзейнічае.

Задача камсамольскай ячэйкі, вучкому і настаўніцтва школы дабіцца ў бліжэйшыя часы наладжаньня абарончай работы школы, ажывіць работу ячэйкі Асоавіяхіму.

С.

Працу ячэйкі АСО—на належную вышыню

Некаторыя ячэйкі АСО ў калгасах, Слуцкага раёну, якія равей не працавалі, зараз распачалі сваю працу.

У саўгасе „Івань“ заняткі ячэйкі Асоавіяхіму праводзіліся ўжо некалькі раз. Патрэбна адзначыць асаблівую зацікаўленасьць да заняткаў і сходаў ячэек Асоавіяхіму з боку жанчын.

Ячэйка АСО пры калгасе „Шляхі калектывізацыі“ перабудавала сваю работу карэнным чынам, ажывіла масавую работу, прымае актыўны ўдзел у правядзеньні гаспадарча-палітычных кампаній. Калгас поўнасьцю ўжо выканаў усе абавязкі перад дзяржавай па збожжы, бульбе і г. д.

Актывістамі ў працы ячэйкі зьяўляюцца камсамолкі і камсамольцы.

Добрай пастаноўкай працы, калгасная ячэйка АСО здолела прыцягнуць да працы аднаасобнікаў — беднякоў і сераднякоў.

Горш справа ў калгасах „Камунар“, „Камінтэрн“, „Пераможца“, „Пралетары“, „1 мая“, „Чырвоны працаўнік“, „Чырвоная Бяроза“, дзе ячэйкі арганізаваліся яшчэ летась, а некаторыя і два гады таму назад, але за ўвесь час свайго існаваньня працы ніякай не праводзяць.

Закупленыя прылады, супроцьгазы, вайсковая літаратура, вінтоўкі і інш. валяюцца дзе папала і выкарыстоўваюцца не па прызначэньні.

Членскія ўзносы больш за год ня ўносіліся.

Раённы савет Асоавіяхіму нават ня ведае, у якіх калгасах ёсьць ячэйкі Асоавіяхіму.

Калі з Масквы прыехалі правяраць работу райсавету, то старшыня замазаў усе недахопы і замест сьпісу членаў і ўліку ячэек гэтага году, якога ў райсавеце няма, падсунуў сьпіс 1931 году.

Райсавет павінен безадкладна распачаць работу па наладжаньні працы ячэек Асоавіяхіму і арганізацыі новых.

Дэлегаткі Случчыны павінны актыўна ўзяцца за абарончую работу. У кожным калгасе павінна працаваць ячэйка Асоавіяхіму.

Я. Кучур.

Наладзіць абарончую работу ў Барысаўшчыне

Абарончая работа сярод жанчын Барысаўшчыны пастаўлена надзвычай дрэнна.

Так, на заводзе імя Домбаля з 40 членаў вайсковых гурткоў толькі 5 жанчын і то на паперы. Гэта тлумачыцца яўнай недаацэнкай абарончай работы з боку райсавету АСО і жансэктару райкому КП(б)Б. Патрэбна на дэлегацкіх сходах арганізаваць лекцыі, даклады аб абароне краіны, трэба ўцягнуць працоўных жанчын у рады Асоавіяхіму. Дэлегацкія сходы павінны ўзначаліць гэту працу.

Саветам і ячэйкам АСО трэба неадкладна заняцца пытаньнем арганізацыі спэцыяльных жаночавайсковых гурткоў. Дабіцца, каб кожная працоўная жанчына вывучыла вінтоўку, супроцьгаз, магла-б аказваць першую дапамогу.

Л. Горфінкель.

Барысаў.

Спэцыяльны працівагаз для коняй.

КУЗЬМА ПРУЦІКАЎ

НЕДАРОСТАК

„Адзін разумны, усімі паважаны вучастковы прыстаў меў адну благую прывычку: седзячы ў кампаніі, ён любіў хваліцца сваімі здатнасьцямі, якіх, трэба аддаць яму поўную справядлівасьць, было ў яго вельмі многа. Ён хваліўся сваім розумам, энэргіяй, сілай, вобразам мысьляй і інш.

— Я моцны! — гаварыў ён.— Хачу—падкову зламаю, хачу—чалавека з кашай зьем!..

— Глядзеце нікчэмныя! Глядзеце і разумейце! Сонца, якое вось на небе з іншымі сьвяціламі і хмаркамі! Яно ідзе з усходу на захад і ніхто ня можа зьмяніць яго шлях. Але я магу! Магу!"

Сакратар партыйнай ячэйкі і ён-жа старшыня калгасу „Кастрычнік" Пліт не прабаваў зьмяняць шлях сонца. Не дарос яшчэ да гэтага.

Ён практыкуецца пакуль на „дробязях", рыхтуючыся да больш буйных і складаных спраў. Можна сказаць, што Пліт ужо ў пэўнай меры прайшоў першую ступень і калі вучастковы прыстаў гаварыў:

— Хачу — чалавека з кашай зьем!

То Пліт можа сказаць аб гэтым ня менш выразна, заявіць аб сваім праве на існаваньне ва ўвесь голас сваімі справамі, патрабаваць да сябе ўвагі.

Вы толькі паслухайце які майстар гэты Пліт, які гэта надзвычайна здатны чалавек! Вы толькі паслухайце, як недаацэньваюцца яго здольнасьці!..

Тав. Шаўлач працавала на Паўночным Каўказе. Паслалі яе калгасьнікі перадаць вопыт сваёй барацьбы за ўмацаваньне калгасаў працоўным Савецкай Беларусі. Прыехала Шаўлач да нас у Капыльскі раён, прыехала з сям'ёй, каб жыць і працаваць.

Як вядома, спэцыялізацыя сельскай гаспадаркі справа ў нас новая, цяжкая. Трэба шмат сіл і энэргіі класьці. Вось, напрыклад, курыца. Птушкай яна завецца. Але якая выгодная птушка. І яйкі і мяса і пух—усё ад гэтай птушкі.

І корму для яе многа непатрэбна. Словам, птушніцкая фэрма — пад руку калгасу: крыніца прыбытку, паляпшэньне матар'яльна-бытавога становішча калгасьнікаў.

Арганізавалі пры калгасе „Кастрычнік" птушніцкую фэрму і інкубатарную станцыю.

Як прыехала Шаўлач, прызначылі яе дырэктарам інкубатарнай станцыі, зрабілі станцыю самастойнай гаспадарчай адзінкай, падначалілі яе менскаму інкубатарнаму цэнтру.

Узялася за працу Шаўлач з вялікай ахвотай, з запалам, найстойлівасьцю. Закапалася з галавой у складаньне рацыёнаў для харчаваньня курэй, занялася пытаньнямі гадоўлі куранят. Пачала кіраваць птушніцкімі фэрмамі.

Не па нутры прышлася курыца Пліту. Ён размаўляў, як многія аб трусох...

— Што гэта за зьвер? Ні табе належнага хваста, ні масьці.

Адным словам курыца ня тыгра паласатая і ня рыкае. А раз ня рыкае, які з яе толк?

— Дарма толькі корм на вецер выкідваем,—нацкоўваў Пліт калгасьнікаў на птушніцкую фэрму.—Каб куры сёньня ўсе да аднэй падохлі, я-б толькі рад быў, страт-бы пазбавіўся.

Але куры як на зло ня дохлі. Хацелі жыць. Псавалі нэрвы заўзятаму адміністратару.

І Шаўлач, як на зло, патрабавала ўвагі курыцы, патрабавала да яе чалавечых адносін.

Вывела гэта ўсё з роўнавагі Пліта.

— Вызваляй кватэру, вызваляй, а то выкіну!—крычыць на Шаўлач.—Вызваляй, не пацярплю!

— Ты, — гаворыць, — досыць, грошай атрымліваеш, каб наняць сабе кватэру ў Капылі. Курамі займаешся ды яшчэ ў калгаснай кватэры будзеш жыць? Не пацярплю, разарву!.. М-м-м-м-му...

Разышоўся, як гішпанскі бугай. Розьніца толькі тая, што бугай горш за ўсё на сьвеце ненавідзіць чырвонага колеру, а наш знаёмы Пліт — курэй. Убачыць курыцу і лезе на сьцену ад злосьці.

— Хачу — чалавека з кашай зьем!

Толькі прыгатаваўся Пліт гэта зрабіць, як Шаўлач паскардзілася ў РКК-РСІ. Прыехаў старшыня КК т. Хайтовіч.

РКК-РСІ знайшла, што не абавязкова адразу чалавека з кашай зьесьці, шго гэта можна зрабіць больш далікатна, як кажуць, у растэрміноўку, даўшы месячны тэрмін Шаўлач для падшуканьня кватэры.

І Пліт пачаў есьці Шаўлач у растэрміноўку, падсылаючы людзей выкідваць яе рэчы.

Куды пойдзе Шаўлач з малымі дзецьмі? На вуліцу? Ня думаў аб гэтым Пліт. Ня думала і РКК-РСІ.

Так, з-за курыцы, якой Пліт адмовіў у праве на жыцьцё, хацелі „чалавека з кашай зьесьці". За што?

Пэўна за тое, што Шаўлач зразумела палітычную сутнасьць і важнасьць разьвіцьця птушніцкай гаспадаркі. Пэўна за тое, што яна нястомна працавала на гэтым адказным вучастку.

Так, за гэта.

Праўда, Пліт не перавярнуў сонца, каб яно не хадзіла з захаду на ўсход, праўда, ён не хапаў зорак з неба і не ламаў падкоў і яму ўсё-ж не ўдалася „чалавека з кашай зьесьці". Але тым ня менш у яго ёсьць многа ад таго вучастковага прыстава, вытрымку з Чэхава аб якім мы вышэй прывялі.

Засталіся ў чалавека адрыжкі мінулага, мінулых мэтадаў, якія зруйнавала рэвалюцыя. Галавацяп у Расійскай імпэрыі быў дапаможнікам царскага самаўладзтва, на якога яно апіралася. Галавацяп у нашы часы, у нашу эпоху—хто-б ён ні быў—дапаможнік клясавага ворага.

Мы бясспрэчна ня можам ставіць знаку роўнасьці паміж чэхаўскім прыставам і Плітам. Гэта па сутнасьці два процілеглыя чалавекі, людзі дзьвёх эпох. Але мы можам і павінны сказаць, што Пліт у значнай меры карыстаецца мэтадамі вучастковага прыстава.

Тым горш для Пліта.

P. S. Па справе тав. Шаўлач спэцыяльна выехала на месца наша супрацоўніца. Увесь прысланы ў рэдакцыю матар'ял пацьвердзіўся.

Капыльская райКК-РСІ прызнала сваю памылку—спыніла зьдзекі Пліта з т. Шаўлач. Пліт зьнят з работы сакратара ячэйкі, выведзены са складу бюро і зьнят з працы старшыні калгасу. Гэта добра.

Урокі справы тав. Шаўлач павінны быць улічаны. Яны вучаць, яны патрабуюць непамерна большай увагі да жанчын-вылучэнак.

Якая карысьць ад земляной грушы (тапінамбура)

Земляная груша—мала вядомая да гэтага часу ў БССР культура—мае вялікае значэньне, як кармовая культура, для сацыялістычнай жывёлагадоўлі.

Над зямлёй расьце земляная груша як сланэчнік, а пад зямлёй растуць клубні, як у бульбы. Ураджай клубняй можна мець ад земляной грушы такі, як і ад бульбы.

Над зямлёй сьцябло мае вышыню ад 2 да 3,5 мэтра. Ураджай сьцяблоў з 1 *га*—30—40 тон, а клубняў—ад 10 да 18 тон з аднаго *га*.

Земляная груша шматгадовая культура. Расьце земляная груша на адным месцы больш 10 год.

Размнажаецца земляная груша ў першы год клубнямі, часткамі клубняй і рассадай. Садзіць клубні трэба позьняй восеньню ад 10/X да першых марозаў, ці раньняй вясной, як толькі будзе магчымасьць пачынаць апрацоўку глебы ў полі.

Клубні для асеньняй пасадкі трэба выкапаць увосень, а для веснавой—вясною.

Рассада ў вялікай колькасьці паказваецца з зямлі ў выглядзе надземных парасткаў на старых засевах земляной грушы, пачынаючы з другога году культываваньня.

Рассада паказваецца з зямлі ў канцы красавіка або ў пачатку мая. Расьце рассада вельмі хутка. Як толькі яна вырасьце на 20—30 *см*, яе трэба выкапаць і скарыстаць для размнажэньня.

З мінэральных угнаеньняў трэба ўносіць на 1 *га* серкакіслага амонія 200 *кг*, супэрфасфату—200 *кг* і калійнай солі—300 *кг*. Гною пад тапінамбур трэба ўносіць ад 20 да 40 тон на 1 *га* з восені ў першы год пасадкі.

Пасадку клубнямі, часткамі клубняй і рассадай можна праводзіць пад плуг, як і бульбу, на адлегласьці 100 *см* або 80 *см* паміж радамі і 60 *см* у радзе. Пасадку клубнямі трэба скончыць да 10/V. а рассадкай—да 10/VI. Пасьля пасадкі рассады трэба яе паліць.

Догляд на працягу лета заключаецца ў 2 разовым абворваньні і ўспульхненьні міжрадзьдзяў „Плянэтам".

Пры ўборцы сьцяблоў земляной грушы на сілас трэба скарыстаць жняваркі, косы і інш. Сьцябло трэба прапусьціць праз сіласарэзку, парэзаць на часткі ад аднаго да 2 х *см* і тады сіласаваць. Уборку сьцябла трэба рабіць не раней 5/X, бо ўвесь рост клубняў праходзіць у верасьні і кастрычніку.

Убіраюцца клубні земляной грушы, як і бульба. Клубні земляной грушы добра пераімоўваюць у зямлі. Для скарыстаньня на зіму клубні трэба выбіраць у кастрычніку, а для веснавога скарыстаньня раньняй вясной.

Да канца другой пяцігодкі земляной грушай трэба засадзіць 2.500 000 *га* па СССР. У 1933 годзе НКЗБ пастанавіў вызначыць плошчу пасадкі ў 700 *га*.

Расьце земляная груша ў Беларусі добра на лёгкіх і сярэдніх суглінках і на асушаных балотах.

З клубняй земляной грушы можна атрымліваць цукар, сьпірт, які ідзе для вырабу каучука і ў розныя стравы як у сырым, так і ў перагатаваным выглядзе. З клубняў земляной грушы можна атрымаць сушаныя крупы, а таксама іх можна тушыць як бульбу. Клубні вясной ядуць у сырым выглядзе як салат, прыгатаваўшы з воцатам і маслам.

На здымку—поле, засаджанае земляною грушай.

Па хэмічнаму складу клубні земляной грушы падобны да клубняў бульбы.

Клубні земляной грушы можна даваць у корм коням, каровам, сьвіньням, трусом, а зялёныя сьцяблы—трусом і курам. Аграном Л. Калеру.

На першай стар. вокладкі—калгасніца за ачысткай насеньня.

ЗДАВАЙЦЕ
ПАДПІСКУ
НА ЧАСОПІСЬ
РАБОТНІЦА І КАЛГАСЬНІЦА
БЕЛАРУСІ на 1933 г.
ЛІСТАНОСЦАМ
АБО
НА ПОШТУ
ЧАСОПІСЬ
ВЫХОДЗІЦЬ
6 РАЗОЎ
У МЕСЯЦ
КАШТУЕ 30 КАП.
У МЕСЯЦ
АДРАС РЭДАКЦЫІ:
МЕНСК, САВЕЦКАЯ 62,
2-Ы ПАВЕРХ. ПАКОЙ № 11.

Выданьне ЦК КП(б)Б. Адк. рэдактар Э. ШАПІРА

Друкарня імя Сталіна. Зак. № 338. У ліку 7.800 экз. Менгарліт № 1416